# АНТОН КАРЗОН

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У любой галіне чалавечай дзейнасці ёсць асобы, якія зрабілі больш, чым ведаюць пра іх. Адна з такіх асоб – Антон Сямёнавіч Карзон, беларускі мовазнавец, педагог, арганізатар навукі.

Звестак пра яго жыццё і дзейнасць няма ні ва ўнікальным біябібліяграфічным даведніку М. Булахава «Восточнославянские языковеды» (1976–1978 гг.), ні ў працы І. Германовіча «Беларускія мовазнаўцы» (2006–2008 гг.), ні ў галіновай энцыклапедыі «Беларуская мова» (1994 г.), ні нават у «Беларускай энцыклапедыі» ў 18 т. (1996–2004 гг.). Разам з тым якраз на плячах гэтага чалавека ляжала адказнасць за стварэнне першых пасляваенных падручнікаў для школьнікаў і па арганізацыі выкладання лінгвістычных дысцыплін у Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце. Менавіта ў гэтай навучальнай установе пасля вызвалення

сталіцы Беларусі Антон Сямёнавіч узначаліў кафедру беларускай і рускай моў і займаў гэтую пасаду на працягу 5 гадоў – да 1949 г.

Універсітэцкі этап працы А. Карзона яшчэ часткова памятаюць прадстаўнікі старэйшага пакалення беларускіх лінгвістаў, у той час, як пра даваенны перыяд жыцця і дзейнасці гэтага чалавека шырокім колам беларускай грамадскасці амаль нічога не вядома.

Антон Сямёнавіч нарадзіўся 24 красавіка (па старым стылі) 1897 г. у сялянскай сям’і ў Мінскай губерні. Заўважым, што пры рэгістрацыі нованароджанага ў метрычнай кнізе Хатлянскай царквы яго прозвішча было пазначана як *Корзун* [2, арк. 12]. Дзяцінства прайшло ў цяжкай сялянскай працы, пасля таго, як у 1902 г. памёр бацька, маленькі Антон як мог дапамагаў маці весці небагатую гаспадарку.

Да кастрычніцкай рэвалюцыі А. Карзон атрымаў пачатковую адукацыю і нават паспеў адпрацаваць адзін год настаўнікам, аднак у 1916 г. быў прызваны на вайсковую службу, якую праходзіў у чыне пісара Мінскага раёна. Пасля рэвалюцыйных падзей і абвяшчэння Беларускай народнай рэспублікі А. Карзон спрабаваў вярнуцца да педагагічнай дзейнасці: у студзені 1918 г. ён уладкаваўся настаўнікам у адну з вясковых школ на Міншчыне. Энергічны малады педагог ужо праз пяць дзён знаходжання на новай пасадзе быў абраны старшынёй валаснога настаўніцкага саюза. Аднак у новых сацыяльна-палітычных умовах прафесійныя ваенныя былі патрэбныя больш за саматужных настаўнікаў, і з сярэдзіны кастрычніка 1919 г. А. Карзон становіцца памочнікам каменданта чыгуначнай станцыі Калінкавічы. У 1922 г. ён пераводзіцца на аналагічную пасаду на станцыю Мінск, а яшчэ праз год службы дэмабілізуецца з прысваеннем воінскай кваліфікацыі «камандзір запасу» [2, арк. 14].

Маладому чалавеку, праверанаму франтамі Грамадзянскай вайны, было нескладана знайсці сабе працу ў пострэвалюцыйнай краіне. Пасля дэмабілізацыі Антон Сямёнавіч працаваў на розных адказных пасадах у Мінску, уваходзіў у склад камісіі аховы працы 1-га групкама Працасветы, быў настаўнікам 7-й Савецкай школы г. Мінска. Аднак з кожным годам усё больш востра паў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

ставала пытанне аб атрыманні адпаведнай адукацыі. У 1925 г. А. Карзон паступіў на Вышэйшыя курсы беларусазнаўства, адкрытыя Народным камісарыятам асветы БССР. Будучы мовазнавец вывучаў тэорыю, практыку і гісторыю беларускай мовы, гісторыю беларускай літаратуры, гісторыю і геаграфію Беларусі, этнаграфію і гісторыю беларускага мастацтва, педагогіку і гісторыю педагагічных ідэй, а таксама пазнаёміўся «практычна і тэорэтычна з комплекснай сыстэмай, Дальтон плянам і выканаў практычную працу па сыстэме народнае асьветы» [2, арк. 7]. Дзякуючы курсам Антон Сямёнавіч змог пазнаёміцца з поглядамі вядомых беларускіх навукоўцаў і грамадскіх дзеячаў М. Азбукіна, А. Баліцкага, С. Васілейскага, В. Дружчыца, Я. Лёсіка, М. Піятуховіча і інш. [2, арк. 7]

Набыўшы сярэднюю адукацыю, А. Карзон падаў дакументы на паступленне ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, аднак прыёмная камісія адмовіла маладому чалавеку на падставе таго, што ён не мае двухгадовага стажу педагагічнай працы пасля заканчэння Вышэйшых курсаў беларусазнаўства. У жніўні Карзон, атрымаўшы згоду Народнага камісарыята асветы БССР, звярнуўся ў праўленне БДУ з заявай наступнага зместу:

> «У Праўленьне Белар. Дзяржаўн. Унівэрсыт. цераз Прыймовую Камісію Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту настаўніка 7-ай Савецкай школы г. Менску – Карзона А. С.

Заява.

Я з'яўляюсь сынам селяніна і з I9I5 г. і да сучаснага моманту працую настаўнікам з перарывамі, дзякуючы службе ў старой і Чырвонай Арміі: у першай – па прызыву, а ў Чырвонай добраахвотна 5 год. З Чырвонай Арміі я звольніўся ў канцы I923 году. Пасьля звальненьня з Чырвонай Арміі стан майго здароўя быў настолькі парушан, што некалькі гадоў працягваць асьвету ня было магчымасьці. У I925 / 26 вучэбным годзе я скончыў Вышэйшыя Курсы беларусазнаўства. У гэтым годзе я падаў заяву ў Б.Д.У. з просьбай залічыць мяне студэнтам першага курсу, заручыўшыся дазволам Наркамасьветы аб залічэньні папярэдняга стажу ў лік патрэбнага пасьля

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сканчэньня курсаў. У залічэньні мяне студэнтам Б.Д.У. мне адмоўлена. У той час, як я служыў у Чырвонай Арміі, мае таварышы па школе пасьпелі атрымаць вышэйшую асьвету, а я, дзякуючы службе ў Чырвонай Арміі, прымушан быў пераносіць цяжар грамадзянскай вайны і пазбаўлен магчымасьці атрымаць асьвету. У час навучаньня на Курсах, а таксама і цяпер я працую ў школе без перарываў. Прымаючы пад увагу ўсе вышэйнапісанае, прашу перагледзець маю справу, залічыўшы ў лік патрэбнага стажу пасьля сканчэньня курсаў, калі не пэдагагічную маю папярэднюю працу, то хоць пяць год дабраахвотнай працы ў Чырвонай Арміі і не адмовіць у залічэньні мяне студэнтам I курсу Б.Д.У., калі ж гэта немагчыма, то прашу дазволіць мне слухаць лекцыі вольным слухачом з правам здачы залікаў і адпрацоўкі сэмінарый.

9/IX – 1927 г. А. Карзон» [2, арк. 3–3 адв.]

Асаблівую значнасць, на наш погляд, мае апошні сказ...

Прашэнне А. Карзона было разгледжана, і ён у верасні 1927 г. стаў студэнтам педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

У далейшым лёсе гэтага чалавека шмат белых плям. Маўчаць архівы пра яго працу пасля заканчэння БДУ, пра тое, дзе і чым ён займаўся падчас Другой сусветнай вайны.

У 1950–1960-я гг. імя А. Карзона было даволі вядомым у Беларусі. Ён стаў адным з аўтараў першых стабільных падручнікаў па беларускай мове для сямігадовай і сярэдняй школы. Першая частка «Граматыкі беларускай мовы» А. Карзона і М. Жыркевіча «Фанетыка і марфалогія» выйшла ў Мінску ў 1946 г., а другая частка («Сінтаксіс») была надрукавана годам раней (у 1945 г.).

Сучаснікі вельмі прыхільна сустрэлі гэтыя выданні. Так, П. Юргелевіч пісаў, што «аўтары “Граматыкі беларускай мовы” т. т. Жыркевіч і Карзон стварылі школьны падручнік па беларускай мове, значна лепшы ранейшых школьных падручнікаў, напісаных да іх. У ім яны здолелі ўнікнуць многіх памылак, уласцівых гэтым апошнім. Напрыклад, яны правільна аднеслі гук “в” у беларускай мове да губна-губных, наперакор некаторым “навуковым” граматыкам беларускай мовы, якія адносяць яго да губна-зубных» [3, с. 82].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Разам з тым у падручніку былі і пэўныя недахопы: не заўсёды ўдалыя фармулёўкі (*словам называецца гук ці злучэнне гукаў, якія выражаюць пэўны сэнс*), недахопы ў класіфікацыі гукаў (аўтары вылучылі гукі галосныя, зычныя і паўгалосныя, не патлумачыўшы, якія канкрэтна гукі адносяцца да апошняй групы), разыходжанні ў напісанні некаторых слоў з «Арфаграфічным слоўнікам» (1948 г.) М. Судніка і М. Лобана (*поўадкрыты, поўаркуша*), выкарыстанне тэрмінаў-русізмаў (*нёба* замест *паднябенне*), хібы ў інтэрпрэтацыі асобных моўных фактаў і інш. [3, с. 82–93].

Ва ўмовах пасляваеннага недахопу навуковай і вучэбнай літаратуры «Граматыка беларускай мовы» А. Карзона і М. Жыркевіча, нягледзячы на некаторыя заганы, стала надзвычай запатрабаванай. Першая частка «Фанетыка і марфалогія» перавыдавалася 7 разоў (7-е выд. у 1953 г.), а другая («Сінтаксіс») на працягу 10 гадоў вытрымала 10 перавыданняў [1, с. 209–210]. Аднаго гэтага дастаткова, каб зацікавіцца лёсам яе аўтараў.

### Літаратура

1. Бібліяграфічны ўказальнік літаратуры па беларускаму мовазнаўству / склад. М. А. Жыдовіч, Я. М. Рамановіч, А. К. Юрэвіч ; адказны рэд. Л. М. Шакун. – Мінск : БДУ, 1960. – 223 с.
2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 205. – Воп. 3. – Спр. 3539.
3. Юргелевіч, П. Аб граматыцы беларускай мовы (крытычны разбор стабільнага падручніка для сямігадовай і сярэдняй школы аўт. М. [illegible] Жыркевіча і А. С. Карзона) / П. Юргелевіч // Савецкая школа. – 1949. – № 3. – С. 80–93.

# АЛЯКСАНДР КРУТАЛЕВІЧ

Аляксандр Прохаравіч Круталевіч нарадзіўся ў Варшаве ў 1894 г. Яго бацькі паходзілі з сялян, яны шмат увагі надавалі народным традыцыям і выхоўвалі ў сына павагу да нацыянальнай культуры. Таму нядзіўна, што з маладых гадоў сваёй роднай мовай Аляксандр лічыў беларускую [22, арк. 1].

У 1914 г. ён атрымаў сярэднюю адукацыю: закончыў прэстыжную Мінскую мужчынскую гімназію і паступіў на матэматычнае аддзяленне фізічна-матэматычнага факультэта Імператарскага Маскоўскага ўніверсітэта. Нягледзячы на дастаткова складаныя ўмовы для навучання (у сувязі з пачаткам Першай сусветнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ